# Эколагі і энергетыкі прыйшлі да балотнага кампрамісу.

Новы дакумент падзяліў экасістэмы на чатыры групы па мэтах выкарыстання. Натуральныя балоты будуць знаходзіцца пад аховай, распрацоўка і здабыча торфу на гэтых тэрыторыях забаронена. Другая і трэцяя групы — гэта фонд асабліва каштоўных відаў торфу і распрацоўваемы фонд, у які ўваходзяць тарфяныя радовішчы, дзе вядзецца альбо плануецца прамысловая здабыча торфу. У зямельны фонд трапілі тарфянікі, якія выкарыстоўваюцца ў сельскай і лясной гаспадарках. Па кожнай групе распрацаваны план мерапрыемстваў, разлічаны на 15 гадоў.

— Стратэгія ўпарадкавала працэс выкарыстання тарфянікаў. Дакумент зроблены супрацоўнікамі Акадэміі навук пры садзейнічанні Мінпрыроды і фінансавай дапамозе міжнародных арганізацый, — адзначыў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Каўхута.

Таксама міністр паведаміў, што яшчэ тры тэрыторыі — “Палеская даліна ракі Буг”, “Сервеч”, “Вілейты” — унесены ў Рамсарскі спіс водна-балотных угоддзяў міжнароднага значэння. Такім чынам, сёння ў Беларусі налічваецца 20 такіх водна-балотных угоддзяў.

— Я ганаруся тым, што Беларусь, дзякуючы падтрымцы Праграмы развіцця ААН, першай з краін СНД займела гэтую стратэгію, — падзяліўся Пастаянны прадстаўнік ПРААН у Рэспубліцы Беларусь Санака Самарасінха. — Па аднаўленні тарфянікаў ПРААН і Беларусь супрацоўнічаюць з 1999 года. За гэты час рэалізаваны праекты па паўторным забалочванні і захаванні водна-балотных угоддзяў на агульную суму 10 мільёнаў долараў.

На працягу доўгага часу тарфяныя балоты былі прадметам спрэчак паміж энергетыкамі і эколагамі. Па словах кіраўніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Наталлі Мінчанкі, некалькі гадоў таму грамадскія абмеркаванні па пераўтварэнні заказніка “Азёры” пад торфаздабычу паказалі, што ў краіне адсутнічаюць адзіныя падыходы па захаванні і рацыянальным выкарыстанні тарфянікаў. Для рашэння гэтай праблемы была створана рабочая група, куды ўвайшлі спецыялісты розных міністэрстваў. У рамках праекта ПРААН/ГЭФ “Тарфянікі-2” у Беларусі з’явіліся нацыянальныя і міжнародныя эксперты па гэтых пытаннях. Новы дакумент пацвярджае: баланс паміж эканомікай і экалогіяй у Беларусі будзе дасягнуты.

— Мне хацелася б адзначыць, што энергетыкі ставяцца да тарфянікаў вельмі педантычна і робяць свой унёсак па рацыянальным выкарыстанні экасістэм. Некалькі гадоў таму ў торфаздабываючай прамысловасці налічвалася 28 прадпрыемстваў, сёння іх 18, у галіне заняты 4 тысячы чалавек, — распавёў першы намеснік міністра энергетыкі Леанід Шанец. — У 1990 годзе мы здабывалі 12 млн тон торфу ў год, сёння гэтая лічба не перавышае 3 млн тон. Тарфянікі, на якіх вядзецца здабыча торфу, пасля паўторна забалочваюцца. Сумесна са спецыялістамі Акадэміі навук мы рэалізуем праект па глыбокай перапрацоўцы торфу.

Стратэгія акрэслівае жаданыя вынікі: напрыклад, мяркуецца захаваць у натуральным стане 684 тысячы га балот, аднавіць не менш за 15% плошчы парушаных тарфянікаў, здабываць не менш за 10 тысяч тон журавін штогод, эфектыўна распрацоўваць раслінную біямасу балот, зменшыць пажаранебяспечныя тэрыторыі, развіваць экалагічны турызм.

***Кацярына РАДЗЮК***

**Источник:** Родная прырода. — 2016. — № 2. — С. 11.